Opłata pocztowa
uiszczona ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошау.

НАШ ГОЛАС

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—3 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата напрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 10 — Вільня, Субота 26-га лютага 1927 г. — Год I

Забава у „незалежнасьць“.

Польская дзяржаўная палітыка ў адносінах да суседніх народаў — беларусаў, украінцаў і літвіноў—пачынае рабіцца, як кажуць, *„актыўнай“*.

Ніжэй мы зьмяшчаем стацьцю аб *польска-літоўскіх адносінах*, у якіх намячаецца „новы курс“, пацьверджаны, паміж іншым, і дазволам ковенскім літоўскім дзеячам прыехаць у Вільню на пахароны д-ра Яна Бассановіча. Тут спынімся на адносінах урадавае прэсы да вырашэньня *беларускага і ўкраінскага пытаньняў*—не як пытаньняў аб беларускай і ўкраінскай *„меншасьцях“* у Польшчы, але як аб *суцэльных і самастойных народах*.

У аўторкавым нумары офіцыозу пілсудчыкаў „Глос Правды“ зьмешчана перадавіца пад загалоўкам „Прызнаньне Незалежнасьці“, у якой газэта падае такую грунтоўную разьвязку ўкраінскага пытаньня. Гэта—прызнаньне *незалежнасьці Украіны*. Рэдакцыя абяцуе ня толькі прызнаць незалежніцкія імкненьні ўкраінцаў — і то да „поўнай, нічым ня зьвязанай незалежнасьці“, але і „падтрымліваць працу ў гэтым кірунку“ і навет „прызнаваць чэснымі толькі тых украінцаў, якія гэтае імкненьне стаўляюць на першым месцы сваей праграмы“... Праўда, далей у тэй-жа стацьці гаворыцца аб тым, што будаваньне незалежнай Украіны мае адбываецца... *у Кіеўшчыне*! А што было-б, калі-б украінцы ўзяліся за такое будаўніцтва ў межах Польшчы,—ну, аб гэтым газэта маўчыць: за яе гаворацць красамоўна судовыя прыгаворы за імкненьне да адарваньня ад Польшчы часткі „яе“ тэрыторыі.

У той самы дзень, як варшаўскі орган пілсудчыкаў „абвяшчаў“ „поўную і нічым ня зьвязаную незалежнасьць Украіны“,—віленская газэта тэй-жа групы „Кур‘ер Віленскі“ роніць горкія сьлёзы з прычыны таго, што... „сусьветная вайна дала нам усім вызваленьне, ды разам з намі зрабіла вольнымі ўсе народы Эўропы, апрача трох: *Грузінаў, Украінцаў і Беларусаў*“. І ў канцы газэтнай стацьці чытаем заклік да такіх глыбокіх зьменаў у дзяржаўнай будоўлі Польшчы, каб „Польшча, упраўляная цэнтралістычна, канчалася на лініі Сану, Буга і Нёмна, а далей—гэта былі-б абшары, якія ў адносінах да Польшчы былі-б хоць-бы на правох *калёніяў*“...

„Маем прыклад у Англіі, якая йдзе далей, бо робіць *блізу незалежнымі* адну калёнію за аднэй і гэтым запраўды-ж толькі ўзмацоўвае сваю імпэрыю, ды навет Ірляндыі дала волю, бо зразумела, што шкоды ад гэтага ей ня будзе. Ці-ж народ, які выдаў з сябе Міцкевіча, ня здольны зразумець тое, што зразумелі англійскія купцы?“

Ясна, якую *надзею* хоча орган пілсудчыкаў збудзіць і ў беларусаў, ды чаму стацьця названа красамоўным загалоўкам: „Не адбіраць надзеі?“ А калі прыпомнім, як паўгоду назад віленскае „Слово“ суліла дапамогу тым „ідэйным беларусам“, якія згадзіліся-бы арганізаваць дывэрсыйныя банды на тэрыторыі Радавае Беларусі, дык аналёгія з „прызнаньнем“ незалежнасьці Украіны будзе поўная: ўкраінцам паказуюць на Кіеў, беларусам—на Менск...

Правільна: законы, на падставе якіх паслу Барану далі 4 гады катаргі за імкненьне да адарваньня часьці польскае тэрыторыі (Зах. Беларусі) і стварэньня з яе незалежнае рэспублікі, — дагэтуль не скасаваны ў Польшчы. Дык ясна-ж: няхай там беларусы будуюць сабе „незалежную і нічым ня зьвязаную Беларусь“ — на тэрыторыі *Радавага Саюзу*, ды няхай кінуць дабівацца пад Польшчай такіх „драбніц“, як школа ў роднай мове, як канстытуцыйныя свабоды, як праўдзівы самаўрад, як права вольнага арганізаваньня свайго жыцьця — культурна-нацыянальнага і сацыяльна-эканамічнага.. Польшчы, пэўне-ж, будзе—*спакайней*!

Польшча і Літва.

У сувязі з тэй маніфэстацыяй польска-літоўскага „прымірэньня“, у якую пахароны д-ра Яна Бассановіча ператварылі арганізатары ўсяе ўрачыстасьці, — польская прэса ўдзяляе вельмі многа месца справе польска-літоўскае згоды.

Але пахароны Бассановіча—гэта толькі нагода дзеля выяўленьня таго, што ў гэта справе робіцца за кулісамі польскага і літоўскага грамадзянства і ў чым выяўляецца рука спрытнага рэжысэра—Англіі... На тое-ж і зроблены фашыстаўскі пераварот у Літве, каб правясьці ў жыцьцё задуманы англійскай дыпляматыяй плян.

Які ж гэта плян?

Скарыстаемся з публікацыяў заграмічнае прэсы аб гэтай справе.

30 сьнежня 1926 г. венская газэта „Нэйе Фрэйе Прэсэ“ падала плян „уміратварэньня Усходу Эўропы“. Плян прадугледжвае аднаўленьне вуніі між Польшчаю і Літвою. **У межах Польшчы Літва атрымлівае аўтаномію з тым, што ў яе склад уваходвіць Вільня і Віленская вобласьць.**

Плян гэты—дужа непапулярны сярод літоўскага грамадзянства і літоўскіх працоўных масаў. Дык фашыстаўскі ўрад, які з дапамогай Англіі аружнай сілай захапіў уладу ў Літве, мусіць з вялікай асьцярожнасьцяй падыходзіць да рэалізацыі пляну польска-літоўскага аб‘яднаньня, І тут, як прыманка, высоўваецца на першы плян справа Вільні.

Афіцыёз новага ўраду „Летува“ ў перадавіцы ад 30-га сьнежня піша: „Адносіны між Літвой і Польшчай, пасьля таго, як праз захват Вільні Жэлігоўскі скасаваў Сувальскі дагавор 9-га кастрычніка 1920 году, ня маюць сабе роўнага прыкладу ў-ва ўсёй пасьляваеннай гісторыі міжнародавых адносінаў... У аснове літоўска-польскага канфлікту, поруч з матар'яльнаю прычынаю спрэчак, якія закранаюць толькі гэтыя дзьве дзяржавы, ёсьць і факт зьняважаньня міжнароднага права, які палякі імкнуцца легалізаваць. З гэтаю мэтаю варшаўскі ўрад любіць часта рэклямаваць свае „міралюбныя“ адносіны да Літвы, выяўляючы справу так, нібыта вінавайцам сучаснага становішча зьяўляецца не яна, Польшча, а Літва. Апошпія заявы Пілсудскага і Залескага аб гатоўнасьці палякоў кожную хвіліну распачаць нармальныя зносіны з Літвою, зразумела, не закранаючы віленскага пытаньня, зьяўляюцца прадоўжаньнем польскай палітыкі з мэтаю прымусіць Літву прызнаць сучаснае палажэньне... Такія чаканьні і надзеі ня маюць ніякай падставы. Палітыка Літвы ў адносінах да Польшчы даўно ўстанавілася і зьяўляецца зусім выразнаю. Літоўскія патрабаваньні не зьяўляюцца максымальнай праграмай, гэта ўсяго толькі мінімальныя варункі для заснаваньня нармальных адносін між двума суседнімі дзяржавамі. **Ніякі літоўскі ўрад, якога-б партыйнага напрамку ён ня быў, ня можа адмовіцца ад патрабаваньня вярнуць Вільню**“.

Спроба зроблена. Ня трацяць часу і міжнародавыя зводнікі. Праз нейкі час вынікі пачалі ўжо паказвацца.

У сваім выступленьні перад чужаземнымі журналістамі аб напрамку заменжнай палітыкі Літвы, старшыня ўраду прафэсар Вальдэмарас ужо знаходзіць **мягкія ноткі па адрасу Польшчы**. У апазіцыйнай газэце „Літувос Жыніёс“ хапіла досыць грамадзянскай адвагі, каб выкрыць супярэчнасьці ў славах і паступках новых гаспадароў Літвы:

„...Заява прэм‘ер міністра і міністра заменжных спраў Вальдэмарса прадстаунікам друку аб напрамку заменжнай палітыкі новага ўраду выклікала заграніцаю вельмі розныя тлумачэньні. Дзяржавы, з якімі Літва можа і, грунтуючыся на сучасным палажэньні, павінна быць у добрых адносінах, як прыбалтыцкія дзяржавы, зараз аказваюцца адхіленымі ад заснаваньня гэтых добрых адносін на падставе таго, што гэта-ж зьяўляецца палітычным рамантызмам.

„Другая дзяржава, якая падтрымлівала нашы інтарэсы, якая дапамагла ізноў узьняць важнае для нас віленскае пытаньне ў шырокім сусьветным абхваце—СССР—сёньня ўжо выразна настроена проці нас.

„Застаецца Польшча, якая можа прапанаваць нам перагаворы, якія могуць быць, як заявіў прафэсар Вальдэмарас, прынятымі“. (Летувос Жыніёс 3./I. 1927 г.).

Паступовая эвалюцыя палітыкі літоўскага ўраду ў памянёных вынятках з літоўскай прэсы выступае з поўнаю вачавіднасьцю. Ад катэгарычнага заяўленьня аб немагчымасьці ўстанавіць якія-небудзь узаемаадносіны з Польшчаю літоўскі ўрад паступова даходзіць да адкрытай прапазіцыі распачаць перагаворы.

Калі да гэтага дадаць заяву лідэра літоўскіх эс-дэкаў Кайрыса пасьля перавароту, які ахарактарызаваў пазіцыю ўраду ў віленскім пытаньні „акамянелаю“, дык будзе зразумелым, што за палітычнымі кулісамі сучасны фашыстаўскі ўрад Літвы вядзе край па шляху пагоджаньня з Польшчаю—за зварот Літве Вільні.

Дзеля таго-ж Англія так рупіцца аб польска-літоўскае прымірэньне?

Радавая прэса, якая асабліва чутка адгукаецца на выпадкі ў Літве, дае на гэта просты і ясны адказ, Англія імкнецца да таго, каб утварыць на Усходзе Эўропы „адзіны процібальшавіцкі фронт“! Да гэтага фронту ўжо ўведзена Польшча і Румынія. Але Польшча мае пад бокам ворага — хоць і малога, але небясьпечнага: гэта — Літва. І вось Англія рукамі літоўскіх фашыстаў скінула даволі прыхільны да Радавага Саюзу сацыялістычны ўрад Сьляжэвіча і праз фашыстаў хоча зьвязаць Літву з Польшчай...

Але ёсьць і другая камбінацыя. Англійская палітыка ў Эўропе ідзе ка шляху самага шчыльнага аб‘яднаньня з Нямеччынай. Тая-ж першым варункам дружбы з Англіяй стаўляе трэбаваньне перагляду польска-нямецкае граніцы і звароту Нямеччыне так-званага „Гданскага калідору“ і Горнага Сьлёнску... Вось, каб здаволіць і Нямеччыну, і не пазбавіць Польшчу патрэбнага ей дзеля жыцьця доступу да Балтыцкага мора, Англія і маніцца за „калідор“ і Горны Сьлёнск аддаць Польшчы Літву з портам Клайпэдай...

У такой плошчы мы і павінны разглядаць сучасны польска-літоўскі флірт, распачаты — хоць і ня зусім прыстойна — над сьвежай магілай толькі-што намёршага барацьбіта за дзяржаўную незалежнасьць Літвы.

Знаменная заява літоускага прэзыдэнта.

Польская прэса падае цалком тэксты прамоваў, якімі абмяняліся новы французскі пасол у Літве і літоўскі прэзыдэнт у часе першай візыты пасла ў прэзыдэнта.

Французскі пасол, націскаючы на паразуменьні з Польшчай, выразіў гарачае нажаданьне, каб—„між сябрамі аднэй сям‘і насталі ўрэшце адносіны, абапертыя на даверы, салідарнасьці і пашане для супольных ідэалаў працы і прагрэсу“.

Прэзыдэнт адказаў, што літоўскі народ, сьведамы сваіх правоў, ніколі не адмовіцца ад шуканьня шляхоў да міру... Моцная воля дайсьці да паразуменьня можа часта давясьці да рэзультатаў **зусім неспадзяваных...** „Эўропа, як і наш край, вельмі патрабуе міру. Дык ані я, ані мой урад ніколі ня возьмем на сябе адказнасьць за нарушэньне міру між народамі“.

Польскі ўрад вельмі гасьцінна прыняў літоўскую хаўтурную дэлегацыю ў Вільні. Дык можа й запраўды наступяць гэтыя—„неспадзяваныя рэзультаты“?!

Да падпішчыкау.

Просім усіх тых паважаных падпішчыкаў, каторыя маюць які колечы інтарэс у адміністрацыі нашае газэты, прытрымлівацца гэтых правілаў.

1) Падпісную плату перасылаць беспасрэдна ў адміністрацыю з паказаньнем падробнага адрасу падпішчыка, а калі разам прысылаецца ад некальніх падпішчыкаў, дык адрас кожнага падпішчыка і кольні ад каго грошы.

2) Пры ўсялякай перапісцы падаваць свой дакладны адрас, абавязкава з паказаньнем тае пошты, з каторае атрымліваеце газэту.

3) Пры перамене адрасу падаваць дакладна абодва адрасы — стары і новы, або: каму спыняецца і хто будзе атрымліваць надалей.

У Сойме.

Новы канфлікт паміж урадам і Соймам.

На апошнім (23/II) паседжаньні адміністрацыйнай камісіі Сойму, якая пастанавіла змусіць урад выразна высказацца аб сваім становішчы адносна да апрацоўваных камісіяй самаўрадавых законаў, выступіў ад імя ўраду адзін з вышэйшых урадоўцаў мін. унтраных спраў—з вельмі рашучай заявай. Заява гэтая тым больш цікаўна. што Сойм. даючы цэлы рад вельмі важных паўнамоцтваў ураду—ў справе „дэкрэтнага законадаўства“, ня даў яму права вырашаць гэтым шляхам справы самаўрадаў, пакідаючы апрацаваньне самаўрадавых законаў нармальнаму законадаўству.

Прадстаўнік ураду заявіў, што ўрад ня можа прызнаць за падставу свайго супрацоўніцтва з Соймам тых 6 законапраектаў, якія камісія ўжо апрацавала ў другім чытаньні. Істнуе надта вялікая розьніца паглядаў ураду і камісіі, дый камісія зусім не апрацавала праекту аб „ваяводзскім самаўрадзе“, які урад лічыць найважнейшым. Усе самаўрадавыя законы павінны складаць адналітую цэласьць, якую завяршаць павінен якраз „ваяводзкі самаўрад“; без яго-ж усе камісыйныя праекты—цела без галавы. Падаваньне папраўак да гэтых праектаў заняло-бы залішне шмат часу, а ў гэтага Сойму часу яго ўласнага жыцьця — няшмат, дык можа ён папросту ня здолее грунтоўна і дакладна зрабіць да канца ўсю гэтую важную працу... Але ўрад лічыць канешным чымхутчэй пусьціць у ход самаўрады ў краі, дзеля чаго заяўляе гатоўнасьць прыняць за падставу так-зв. „малы самаўрадавы законапраект“ (двух паслоў-пілсудчыкаў-сельсаюзьнікаў, апрацаваны—ў міністэрстве...).

Пасьля гэтае заявы, завязалася вельмі вострая дыскусія, у якой найбольш рашуча выступалі проці ўрадавага становішча — эндэкі, пэпэсы і прадстаўнікі меншасьцяў. Паслы ня толькі крытыкавалі прапазыцыю ўраду, але і баранілі ад „замаху“ правы Сойму...

У канцы дыскусіі пэпэсавец Прагер запрапанаваў **„ня прыняць да ведама“ заяву ўраду, як нязгодную з Канстытуцыяй. Прапазыцыя гэта была прынята 13 галасамі проці 9.**

За прапазыцыю галасавалі—пэпэсаўцы, эндэкі, хадэкі; проці — пястоўцы, вызваленцы, сельсаюзьнікі і „хрыставыя“ — дубадэкі. Устрымаліся — меншасьці.

Пасьля таго прыняты дзьве прапазыцыі пасла Дымоўскага (эндэка). Першая — аб тым, каб адкінуць зусім бяз чытаньня гэты „малы самаўрадавы праект“ 2 паслоў — прыняты 14 галасамі правіцы і Пяста, проці лявіцы, пры ўстрыманьні ППС; другая — аб тым, каб безадкладна прыступіць (без „супрацоўніцтва ўраду з Соймам“...) да трэцяга чытаньня камісійных праектаў, — прынята 19 галасамі проці 3 галасоў меншасьцяў.

Гэткім чынам камісія Сойму рашуча прыняла кінуты Сойму новы вызаў з боку ўраду... Што будзе рабіць урад пабачым.

У Польшчы.

У справе польска - нямецкай гаспадарчай вайны.

Польская і частка нямецкай прэсы пішуць, што можна спадзявацца ўлагоджаньня польска-нямецкага канфлікту і распачацьця ізноў перагавораў. Быццам дыпляматычныя гутаркі нямецкага пасла Раўшэра з прэм. Пілсудскім давялі да пэўных добрых вынікаў.

Пазыка для Польшчы.

Як паведамляе „Наш Пшэглёнд“, банкір Рубінштэйн, які прыехаў на нейкі час у Варшаву, заявіў карэспандэнтам, што група англійскіх і галяндзкіх капіталістаў гатовы даць Польшчы пазыку на 80 мільёнаў даляраў, але... толькі частку яе—грашмі, а рэшту—англійскімі ваеннымі матэрыяламі!

Шчыра-ж апякуецца Англія сваей новай „прыяцелькай“. Толькі-ж гэную амуніцыю трэба ж будзе неяк спажыткаваць—ведама, праліваючы і сваю і чужую крэў...

Уступка ўраду абшарнікам - цукраварам.

Ня гледзячы на „рашучую забарону“ з боку „сільнага і незалежнага ўраду працы“ п. Бартля, абшарнікі цукравары і гуртаўнікі-цукроўнікі паднялі цану на цукер — па 1[illegible] злотых на мяшку. У крамках зараз-жа [illegible]

Усім краю пукер-пясок падаражэў на 10 гр. на кілё...

Урадавы камунікат наведаміў, што — у зьвязку з гэтым—Гаспадарчы Камітэт Рады Міністраў безадкладна зьбярэцца на паседжаньне, каб „абгаварыць спосабы... барацьбы з маркаваньнямі (?) цукроўнікаў"...

Сьледам за гэтым „Работнік" наведаміў, што Гаспадарчы Камітэт Рады Міністраў сабіраўся і абгаварываў усялякія справы, апрача—беззаконьня цукроўнікаў. — Беззаконьня—бо-ж істнуе закон, які дае ўраду права рэгуляваць цану цукру.

Адначасна з урадам выдалі камунікат і аб'яднаныя цукроўнікі, заявіўшы, што змушаны былі самі падняць цану дзеля таго, што не зрабіў гэтага, ня гледзячы на іх дамаганьні,—урад...

„Камісія Працы" толькі што аблічыла кошты прадукцыі цукру ў Польшчы і сцьвярдзіла вялізарныя зыскі цукроўнікаў. З свайго боку віцэ-прэм. Бартэль заявіў, што — „урад не дапусьціць да новай падвышкі цаны цукру"... А вось, цяпер, калі цукроўнікі начхалі на гэтую заяву, той-жа ўрад пастанавіў - перадаць усю справу на новы разгляд і вырашэньне тром міністрам — скарбу, прамыслу і зямляробства (Чэховічу, Ромоцкаму і—Незабытоўскаму). А тыя, як паведамляе „Rzeczpospolita", зацьвярдзілі зробленую цукроўнікамі самавольна падвышку!

Цікаўная азнака „маральнай санацыі".

Нашыя чытачы пэўна-ж памятаюць справу слаўнага варшаўскага капітана Павлікоўскага, які ў паліцэйскім цыркуле—пры састаўленьні пратаколу—сьпярша аблаяў габена, а пасьля застраліў з рэвальвэру на мейсцы аўтамабільнага шофэра. На судзе сьведкі сьцьвярдзілі, што шофэр не зрабіў абсалютна нічога, каб гэткае паступаньне магло быць, калі не апраўдана, дык прынамся—вытлумачана. Акружны Суд засудзіў шалёнага капітана на 3 гады катаржнай турмы, выдаленьне з службы ды пазбаўленьня ўсіх ордэнаў і г. д., прызнаўшы слушна забойства безбароннага чалавека ня толькі праступным, але і—ганебным... Тады справа была перанесена ў Найвышэйшы Ваенны Суд, які прысуд Акружнога Суда скасаваў, а настанавіў свой, трэба думаць, — больш справядлівы ды „будуёнцы" для п. п. ваенных: капітана Павлікоўскага засудзіў на 1 год, дый ня турмы, але — крэпасьці (кара ганаровая...); у зьвязку з гэтым Суд адкінуў выдаленьне забойцы з войска, а таксама — пакінуў яму ўсе яго „чыны і ордэны".

Падаючы гэты прысуд, „Роботнік" заўважае, што — „прысудаў судовых крытыкаваць—нельга"...

Заграніцай.

Пагражаючая нота Англіі да Радавага Ураду.

23-га лютага англійскі ўрад паслаў радаваму прадстаўніку ў Лёндане ноту, у якой сцьвярджае перадусім — „нездаваляючы стан англійска-радавых адносінаў". Ня гледзячы на ўсе пратэсты англійскага ўраду проці анты-англійскай прапаганды і акцыі Радаў, праца гэтая ня спыняецца. З другога боку, англійскі ўрад рашуча адкідае ўсе закіды Масквы, быццам Англія прымае ўчасьце ў змове проці СССР—з мэтай скінуць там радавы ўрад. Далей нота—перасьцерагае Рады вельмі востра, кажучы, што ёсьць пэўныя граніцы ўсяму, па-за якія — вельмі небясьпечна папіхаць апінію англійскага грамадзянства. Дык — або хай радавы ўрад спыніць сваю варожую акцыю, або—прыдзецца раней ці пазьней парваць ня толькі англа-расейскую таргову ўмову, якая ўсё роўна вя выконываецца, але ў далейшым і — звычайныя дыпляматычныя зносіны з Радамі.

„Парваць дыпляматычныя зносіны", гэта—у даваенныя часы — значыла: аб'явіць вайну. Але да вайны трэба—добра падрыхтавацца. А сам жа англійскі ўрад божыцца, што ён—„ня прымае ніякага ўчасьця ў змове проці Радавае Расеі".

Радавая амуніцыя для Нямеччыны.

Орган нямецкіх сацыялістаў ізноў робіць сэнсацыйныя рэвэляцыі ў справе ваеннага супрацоўніцтва Нямеччыны з Радамі.

Быццам у порце Штэцін у кастрычніку 1926 г. выгружана 500 тоннаў гранатаў з СССР; другі транспарт складаўся з 3.000 тоннаў артылерыйскай амуніцыі, ці—350.000 гранатаў.

Праграма сэсіі Рады Лігі Народаў.

7-га сакавіка мае распачацца вясеньняя сэсія Рады Лігі Народаў. Старшынёй будзе — нямецкі міністар Штрэзэман.

Рада мае разглядзець больш 20 спраў, з якіх найважнейшыя стаяць на праектаванай павестцы ў гэткім парадку:

1) Рад спраў бюджэтна-адміністрацыйных, з якіх цікавіць Польшчу можа справа выплаты пэнсіі Высокаму Камісару Гданска. Дагэтуль пэнсію плацілі Гданскі Сэнат і Польскі ўрад; але сам Камісар зьвярнуўся ў Сэкрэтарыят Лігі, каб лепш плаціла Ліга. Дык Рада мае заняцца гэтай справай.

2) Польскі дэлегат даложыць справу зацьверджаньня парлямантамі розных дзяржаў падпісаных урадамі міжнародных умоваў і канвэнцыяў,—каб прысьпешыць гэтую акцыю.

4) Праект новай сыстэмы выбараў нясталых сяброў Рады.

5) Даклады мандатнай камісіі. Гэты пункт павінен будзе выклікаць страшэнныя спрэчкі, бо Англія робіць усе высілкі, каб заткнуць рот гэтай камісіі, пазбавіўшы яе права рабіць у калёніях на мейсцы рэальную працу—дасьледаў і дапросаў насяленьня.

9) Справаздача аб ліквідацыі грэцка-баўгарскага канфлікту і мерах недапушчэньня на будучыню паўтарэньня яго.

15) Справы, зьвязаныя з склікаваньнем міжнародавай гаспадарчай канфэрэнцыі.

17) Перагляд правоў Высокага Камісара ў Гданску ў галіне прывозу і пераховаваньня ваенных матар'ялаў на тэрыторыі Гданска. Справа вельмі цікавячая Польшчу.

18) Справа склікаваньня канфэрэнцыі ў справе прыватнай фабрыкацыі аружжа.

19) Справа аб спосабах запэўненьня міжнародавай—тэлеграфнай, тэлефоннай, чыгункавай і інш. — камунікацыі ў часе... „палітычных крызісаў" (ня хочуць недэлікатна, але проста сказаць: у часе вайны!).

20) Скаргі нямецкай меншасьці ў Польскай Сілезіі на школьны ўціск з боку польскае ўлады.

22) Назначэньні ў розныя камісіі Лігі.

Найбольш цікаўнай для Польшчы справай будзе падняты нанова канфлікт з Данцыгам (Гданскам), каторы ізноў пачаў вясьці палітыку больш незалежную ад Польшчы.

Англія „аддае" Італіі Турцыю—за дапамогу ў Кітаі.

Жэнэўскі карэспандэнт аднэй з турэцкіх газэт даведаўся, што ў часе гутаркі з Мусоліні англійскі міністар запэўніў Італіі „вольную руку" ў Турцыі, калі Мусоліні дапаможа пабітай Англіі ў яе кітайскай авантуры.

Два батальёны вернены ў Індыю.

Большая частка войска, пасланага Англіяй у Кітай, накіравана з яе калёніі Індыі. Індускія часьці навербаваны пераважна з ваяўнічага індускага пляменьня сікхаў. Дасюль яны лічыліся асабліва пэўнымі і вернымі Англіі.

Аднак, гэтымі днямі сярод сікхаў, якія высадзіліся нядаўна ў Шанхаі, англійская ўлада выкрыла вялікую рэвалюцыйную арганізацыю. Сярод салдат і навет афіцэраў індусаў былі члены партыі Акалі, індускае нацыянальна рэвалюцыйнае партыі, якая змагаецца за вызваленьне Індыі ад англійскага панаваньня. Гэтыя салдаты вялі ўзмоцненую агітацыю, угаварваючы сваіх таварышоў пераходзіць на бок кітайскага рэвалюцыйнага ўраду і супольна з ім змагацца супроць Англіі.

Агітацыя мела вялікі пасьпех. 2 батальёны, сярод якіх уплыў агітатараў быў асабліва моцны, адасланы назад у Індыю. 15 афіцэраў і 40 салдат аддадзены ў рукі вайсковага суду.

Ізноў рэлігійная вайна ў Індыі.

Відаць, у сувязі з завастрэньнем нроціанглійскага руху ў Індыі, дзе народ усьцяж выражае пратэсты нроціанглійскай авантуры ў Кітаі,—распачаліся тамака ізноў рэлігійныя сутычкі ды крывавыя бойкі паміж індусамі і мусульманамі. Ці-ж ня ясна, што гэта—груба правакацыя англійскай дэфэнзывы,—каб адцягнуць увагу насяленьня ў іншы бок!

Барацьба за вызваленьне Кітаю.

За што кітайскі народ ненавідзіць англійцаў.

Англійскі сацыялістычны тыднёвік „Новы Павадыр" падае цікаўныя, але страшэнныя факты вызыску, які сярод Шанхайскіх работнікаў робіцца чужынцамі, а парадусім—англійскімі капіталістамі.

Кітайскія „кулі" (так называюцца звычайныя чорнарабочыя), якія працуюць у порце ці на фабрыках на самых цяжкіх работах, атрымліваюць у месяц ўсяго... каля 40 злотых, а працуюць яны ў дзень — неабмяжаваную лічбу гадзін, сколькі трэба, сколькі кажа гаспадар...

На гэткай нялюдзкай працы пануе страшэнная сьмяротнасьць сярод гэтых „кулі".

У ткацкіх фабрыках працуюць пераважна кабеты і дзеці. **На 6 работнікаў — адно дзіця менш 12 гадоў...** Звычайны дзень працы — **12 гадзін — бяз усякіх перарываў, з зьменамі дзеннай і ночнай — у працягу ўсяго 7-дзённага тыдня.** У асаблівых выпадках работнікі працуюць па 16 гадзін без перарыву... Ніякіх перарываў ці адпачынку ў часе абеду няма: закусі ў часе працы і далей працуй! Плата за гэткую працу — для дарослых 50 злотых у дзень; для дзяцей ад 55 гр. да 1 зл. 10 гр. у дзень.

Усе спробы работнікаў законным шляхам урэгуляваць варункі працы англійскія прамыслоўцы лёгка адкідалі — на падставе тых вынятковых правоў, якімі карысталіся дагэтуль чужаземцы ў Кітаі. У 1923 г. Пэкінскі часовы ўрад выдаў закон аб ахове працы работнікаў на фабрыках, які цягнуў да адказнасьці прамыслоўцаў за найбольш агідныя выпадкі вызыску чалавечай працы. Але закон гэты—у сілу пратэсту ды на падставе „ўмоваў" чужаземных дзяржаваў — ня быў уведзены ў чужаземных канцэсіях.

Калі ў 1924 г. Пэкінскі ўрад выслаў у Шанхай 2 урадоўцаў, а ў Ханькоў—1, каб яны агледзілі варункі працы кітайскіх работнікаў у англійскіх фабрыках, дык англійскія консулы не дапусьцілі іх у англійскія фабрыкі. Толькі пасьля ведамых работніцкіх разрухаў у Шанхаі ў 1924 г. шанхайскі „магістрат" (папросту: англійска-амэрыканскі ўрад шанхайскай чужаземнай калёніі) выбраў камісію, якая апрацавала рад правілаў аб ахове пераважна дзіцячай працы, значна горшы за пэкінскі ўстаў. Але і гэтыя скромныя вымаганьні спаткаліся з рашучым адпорам прамыслоўцаў.

Гэтыя-ж самыя прамыслоўцы засядаюць у Шанхайскім Магістраце ды „Мястовай Радзе", дый робяць, што хочуць, у Шанхаі. А вось кітайцы, якіх у Шанхаі 97 проц., (толькі тры асобы на сто—чужаземцы!), якія плацяць вялікшую частку ўсіх падаткаў, ня маюць голасу ў Радзе Места...

Што-ж дзіўнага, што англійцы так баяцца прыходу ў Шанхай запраўднай народнай кітайскай улады—з Кантону?!

Калі быў узят Ханькоў, зараз-жа ўсе прамыслоўцы падвысілі кітайскім работнікам плату—напалову.

Самі англійскія сацыялісты ў сваім органе пішуць, што англійскі ўрад паслаў свае браняносцы ў Кітай—дзеля абароны даходаў сваіх прамыслоўцаў, якія багацелі дагэтуль літаральна коштам поту, крыві і жыцьця тысячаў кітайскіх работнікаў.

Дык—вось, аб што ідзе гэраічная барацьба ў Кітаі!.

Бой пад Шанхаем пачаўся!

Кітайскія (кантонскія) кананеркі падышлі ўжо пад арсэнал у Кіянг-Хан і пачалі абстрэліваць яго. Зараз-жа былі змабілізаваны ўсе сілы англійскага і францускага флёту. Англійскія і францускія маракі занялі ўсе стратэгічныя пункты ўздоўж чужаземных канцэсіяў. Пасьля гэтага гарматы францускіх крэйсэраў былі наведзены на кананеркі, але ад абстрэлу быццам устрымаліся.

Дапамога з боку СССР.

Англійскія газэты пішуць, што кантонскія войскі перамагаюць сваіх праціўнікаў—

Ці ёсьць фашызм у Польшчы?

Або: „Апазыцыйныя" Пэпэсы на канфэрэнцыі II Інтэрнацыяналу.

(Маленькі фэльетон).

Запраўды,—каб ня было „чэсна і адкрыта апазыцыйных да ўраду" пэпэсаў, дык польскаму ўраду трэба было-б папросту ствapыць іх наўмысна. Дый то ніхто б не патрапіў зрабіць штучна другіх, каб былі так карыснымі для ўраду, як гэтыя натуральныя—„польскія апазыцыйныя сацыялісты"...

Паслухайце-ж, што было толькі-што ў Парыжу.

— — — — — — — — — — —

Галоўным вынікам колькі-дзённай канфэрэнцыі Выканаўчага Камітэту II (сацыялістычнага) Інтэрнацыяналу было выданьне адозвы-маніфэсту да ўсіх работнікаў усіх краёў.

Аб чым-жа кажа і да чаго заклікае гэты Маніфэст?

На першым мейсцы (і слушна!) заклікае ён, каб работнікі ўсіх краёў, а перад усім—Англіі, націснулі крапчэй на свае ўрады, каб тыя спынілі імпэрыялістычную авантуру вялікіх дзяржаваў на чале з Англіяй—проці кітайскага народу, які гэраічным высілкам імкнецца да вызваленьня.

На другім мейсцы II Інтэрнацыянал у сваім Маніфэсьце пратэстуе проці гэткай-жа агіднай авантуры амэрыканскага ўраду ў Мэксыцы і Нікарагуа, які—„цаной мора пралітай крыві хоча здабыць сабе нафту".

На трэцім мейсцы Маніфэст адзначае „небясьпеку, пагражаючую ўсей Эўропе" з боку італьянскага фашызму, які з Італіі пайшоў ужо трыумфальным паходам па ўсім нашым кантынэньце.

Італьянскі фашызм—„пазбавіў пралетарыят усялякіх спосабаў абароны ад вызыску капіталістаў, выгнаў з краю найлепшых прадстаўнікоў дэмакратыі, распачаў тэрор, які перавышае страшэнствы расейскага царату, з Альбаніі зрабіў сваю калёнію, пробуе падпарадкаваць сабе Вэнгрыю, Румынію і Баўгарыю, точыць зубы на Югаславію. — І на ўсё гэта пазычаюць вялізарныя грошы пану Мусоліні—лёнданскія ды нью-іоркскія банкіры!...

Але лёнданскія банкіры ды палітыкі не абмяжоўваюцца падтрыманьнем фашызму ў Італіі: якраз пры іх уплыве і падтрыманьні (грашовым і іншым) пераможным паходам ідзе з Італіі фашызм па ўсей Эўропе...—Фашыстаўская рэакцыя ў Вэнгрыі „зруйнавала дарэшты апошнія сілы краёвай дэмакратыі, ды ўжо—з дапамогай Італіі—рэалізуе лятуценьні аб адбудове манархіі і дынастыі Габсбургаў".

„Абавязак работнікаў і сацыялістаў усіх краёў—сабраць ды скіраваць усе сілы проці італьянскага фашызму і яго слугаў, — проці рэакцыі ў Вэнгрыі, Румыніі і Баўгарыі".

Далей Маніфэст заклікае работнікаў і сацыялістаў проці імпэрыялістычнай палітыкі англійскага ўраду ў Арабіі і Абісініі, якая, падтрымоўваючы фашыстаўскую Італію проці Францыі (а ці-ж і яны запраўды не пралілі ў „сваёй" Афрыцы ніводнай кроплі крыві?), падрыхтоўвае ў Афрыцы—новыя крывавыя бойні.

У сільных словах Маніфэст заклікае работнікаў, каб трэбавалі ад урадаў сваіх краёў—не дапусьціць да адбудовы трону Габсбургаў (яшчэ раз!...) і дамагаліся ад... Лігі Народаў „пратэстаў (!) проці новых небясьпекаў вайны".

„Як зараза, як эпідэмія, разьліваецца фашызм па ўсей Эўропе", моцна кажа Маніфэст. У Літве—фашызм, тэрор проці работнікаў і сацыялістаў. Небясьпека пагражае „ўсім маладым дзяржавам, паложаным паміж Расеяй і Нямеччынай",—асабліва з прычыны сарваньня перагавораў між Нямеччынай і Польшчай.

„Імпэрыялізм і фашызм, супрацоўнічаючы адзін з адным, пагражаюць міру і вольнасьці ўсяго сьвету"... Дык—

„Далоў збраеньні! Далоў крывавы фашызм! Далоў заборчы імпэрыялізм!" І—„хай жыве міжнародавы сацыялізм!"

— — — — — — — — — — —

Так моцна і пекна напісаны гэты Маніфэст.

Дык фашызм—пры падтрыманьні англійскага імпэрыялізму—„разьліўся па ўсей Эўропе". З Італіі—ў Вэнгрыю адтуль—у Румынію, адтуль—у Літву, скуль далей — пагражае ўсім маладым дзяржавам між Расеяй і Нямеччынай.

Кожны адразу пачуе, што ў гэтым пекным ды моцным абразе сучаснага трыумфу фашызму ў Эўропе нешк чагосьці не хапае.

„Глос Правды", знамяніты польскі пісьменьнік Серошэвскі, дый шмат хто іншы ў Польшчы пэўна-ж будуць лаяць гэты Маніфэст II Інтэрнацыяналу—за тое, што там нічога ня сказана аб польскім фашызьме.

Мы ведаем, што ў Польшчы ідзе страшэнная паляміка між „правіцай" Дмовскага і „лявіцай" Пілсудскага—аб тым, хто-ж з іх, які „абоз", мае больш правоў на слаўную марку фашызму. А яшчэ больш людзей ды абозаў знойдзецца ў Польшчы, якія адчуваюць на сваім карку бясспрэчнае істнаваньне фашызму ў Польшчы, не разьбіраючыся ў тым,—ці ён „левы", ці—„правы"...

Шмат хто думае таксама аб польскім фашызьме і ў Эўропе, навет — у „сацыялістычнай Эўропе"!.. Доказам гэтага можа служыць — тая ж самая Канфэрэнцыя II Інтэрнацыяналу, на якой апрацаваны быў гэты Маніфэст.

У наступным нумары „Роботніка", зьмясьціўшага Маніфэст, чытаем у справаздачы аб Канфэрэнцыі:

„У першым тэксьце пастановы і Маніфэсту проці фашызму і ў абароне дэмакратыі — побач з Італіяй, Вэнгрыяй, Літвой і інш. — **названа была і — Польшчы, як край з фашыстаўскім урадам"**...

Але-ж—на што ж тады езьдзілі на канфэрэнцыю ды выдавалі столькі грошы на жыцьцё ў Парыжу—паны пэпэсы?!

Як толькі яны пачулі, што іх Польшчу—перад абліччам усяго сьвету—залічаюць да краёў з фашыстаўскім урадам, — Польшчу, якой кіруюць іх два галоўныя павадыры,—яны ня вытрымалі і заявілі рашучы пратэст, можа навет — пагражаючы (напэўна!) ад'ездам у Варшаву...

І вось —**пад націскам польскай дэлегацыі, паноў пэпэсаў—Недзялковскага і Дыяманта (а зусім ня дзеля іншых прычын!) Польшча была вычыркнена з ліку фашыстаўскіх краёў — прымамся на паперы забойчага Маніфэсту II Інтэрнацыяналу!..**

Мы ня будзем дакладна перадаваць зьместу пекнай і дэлікатнай — запраўды-ж „чэсна і адкрыта апазіцыйнай „прамовы п. Недзялковскага, даводзіўшага, што ў Польшчы няма навет і сьледу фашызму... Ані сьледу! — Папросту толькі — „мы жывем (у Польшчы) пад знакам перавагі аднэй асобы—марш. Пілсудскага",—але—Канстытуцыя пры гэтым выконываецца так, як ніколі нідзе яшчэ на сьвеце ня выконывалася!) літаральна так сказана: „З захаваньнем канстытуцыйных формаў"!.

Хто ж „жондзі краем" пры гэтай „перавазе адзінкі"?

А вось паслухайце-ж усе, як казаў аб складзе польскага ўраду сваім „таварышам-сацыялістам" у Эўропе п. Недзялковскі.

„Правячыя групы (ў польскім урадзе), гэта—частка інтэлігенцыі, дробнай буржуазіі, некаторыя групы („одламы") зямляўласьніцкія—„земяньскія" і „сялянскія". —(Аб работніцкіх „одламах" Марачэўскім, Васілеўскім, Голувко, Земэнцкім і інш.—ані слова).

Ані абшарнікаў, ані буйных прамыслоўцаў, ані ваеншчыны з II Аддзелам у польскім урадзе—і сьледу няма!..

„Дык—ці-ж гэта фашызм?! Ці-ж фашызм калі такі бывае?! Дзе-ж вы бачылі, каб быў такі фазызм?!. Проста—так сабе—„пад знакам перавагі аднэй асобы" жывем сабе і толькі. Далібог больш нічога"!

Вось „абоз" Дмовскага,—бажыўся таварышам п. Недзялковскі,—о, гэта дык — „запраўды фашызм", які — і т. д. і т. д. Так красамоўна даводзіў п. Недзялковскі ў Парыжу на канфэрэнцыі II Інтэрнацыяналу.

І—давёў: **Польшчу зьнялі з Маніфэсту і рэзалюцыяў проці фашызму, разьліўшагася па ўсей Эўропе...** П. Недзялковскі патрэбаваў у таварышоў „даверыя да сябе і да тактыкі („чэснай і адкрытай апазіцыі") ППС у сваім краі, і—атрымаў гэтае даверые...

Ці толькі можна быць пэўным, што тое-ж даверые атрымае ён і яго партыя ў сябе ў Краі, асабліва — ад работнікаў і сялян—на блізкіх мо' ўжо выбарах?!

— — — — — — — — — — —

Залатая гэтая партыя пэпэсаў, асабліва для ўраду, да якога яна стаіць у „апазіцыі"! І калі-б яна не істнавала ў Польшчы, як натуральная, дык запраўды ўраду трэба было-б яе—выдумаць!..

Янук зб. фальварку „Пэпэсіца" пад Пінскам.

Кангрэс паняволеных народаў.

У сталіцы Бэльгіі—Брусэлі—адчыніўся міжнародавы кангрэс, склікавы дзеля барацьбы проці прыгнечаньня калёніяльных народаў. Патрэбнасьць у такім кангрэсе нікслі не адчувалася так востра, як у сучасны момант. Кітай знаходзіцца ў разгары грамадзянскай вайны — вайны проці рэакцыйных генэралаў, якіх падтрымліваюць імпэрыялісты. У галяндзкіх калёніях Яве і Суматры толькі-што сурова прыдушана паўстаньне тубыльцаў. У Сірыі ня спыняецца вайна проці францускіх гвалтаўнікоў. У Мароку жыхары, загнаныя гішпанцамі ў горы, яшчэ не зложылі аружжа. У Нікарагуа спробы амэрыканцаў накінуць пры дапамозе браняносцаў уладу свайго агента спатыкаюць рашучы адпор. Усё гэта толькі найбольш яскравыя моманты барацьбы прыгнечаных народаў—барацьбы, якая перайшла ўжо ў адкрытыя паўстаньні проці імпэрыялістаў.

У іншых калёніях і поўкалёніях масы яшчэ не ўзьняліся, хоць прыгнечаньне і эксплёатацыя чужаземцаў дасягнула і там да апошняе граніцы. Уся Афрыка, большая частка Азіі, усе ціхаакіянскія і атлянтычныя выспы—гэта-ж уласнасьць эўрапэйскіх, амэрыканскіх і японскіх захватнікаў. Апроч таго, значная частка дзяржаў Эўропы, Азіі і Амэрыкі, фармальна незалежных, на дзеле знаходзяцца поўнасьцю ў абцугох чужаземнага капіталу.

Тры чверці чалавецтва прыгнечаны і эксплёатуюцца капіталістычнаю верхавінаю сьвету. І калі-б у Брусэлі ўдалося сабраць прадстаўнікоў усіх прыгнечаных народаў, дык гэта быў-бы самы вялікі кангрэс у гісторыі чалавецтва. Але няшчасьце паняволеных якраз у тым, што ім цяжка арганізавацца.

На парадку дня кангрэсу стаяла пытаньне аб падтрыманьні вызвольнага руху ў калёніях работніцкімі арганізацыямі капіталістычных краёў. Другі пункт — пытаньне аб нагоджаньні вызвольнай барацьбы ў розных калёніяльных краёх. Наколькі насьпела гэтае пытаньне, можна бачыць хоць-бы з таго, што ў сучасны мамэнт Англія пробуе прыдушыць рэвалюцыйны рух у Кітаі пры дапамозе індыйскага войска, а амэрыканцы звычайна прыдушваюць усе выбухі ў сваіх калёніях пры дапамозе нэграў. Кангрэс павінен рашуча выступіць проці ўчасьця аднаго паняволенага народу ў прыдушэньні паўстаньняў другіх паняволеных народаў.

Брусэльскі кангрэс скліканы па ініцыятыве процііпэрыялістычнай лігі, якая створана ў Нямеччыне, якая і сама апынулася ў палажэньні поўкалёніяльнага краю. Незалежна ад таго, кім склікан кангрэс, ён, бясспрэчна, дасьць пачатак сусьветнай арганізацыі па барацьбе за вызваленьне калёніяльных народаў.

дзякучы значнай помачы з боку СССР. У бітве пад Ханг-Джоў было шмат расейскіх кулямётаў.

З другога боку газэты пішуць, што войскі ген. Сун-Чуан-Фанга (англійскага наймітa!) масава пераходзяць на бок чырвонай арміі, „падкупленыя“ кантонскім урадам... Запраўды-ж, трэба думаць, што кантонскі народны ўрад мае больш „срыбнікаў“, чым... англійская буржуазія!

Не ў аднэй Англіі буржуазія перакананa, быццам усё на сьвеце можна купіць.

Забастоўка ў Шанхаі.

Кітайскі камісар абароны выдаў адозву, у якой усім бастуючым урадоўцам — паштавікам пагржае карай сьмерці, калі яны ня стануць на працу.

Трэба дадаць, што паштовая ўстанова знаходзіцца у міжнародавым квартале места, а начальнік пошты — англіец, хаця пошта лічыцца ўласнасьцю Кітаю.

Забастоўка ў Шанхаі, і крывавыя расправы англійцаў.

Забастоўка ў Шанхаі ахапіла ўжо больш як 100 тыс. работнікаў, спыніліся ня толькі чыгункі, але і трамваі, аўтабусы і т. п.

Ваенны губэрнатар Шанхаю (англіец) выдаў загад, пагражаючы карай сьмерці ўсім агітатарам. Трох агітатараў ужо сказьнілі, і галовы іх выстаўлены на паказ, каб страшыць забастоўшчыкаў. Апрача таго ген. Фанг, з свайго боку, дзесяткамі рубіць галовы агітатарам, так сама выстаўляючы іх на брамах места. Гэтак забіты ўжо больш як 1,000 „агітатараў“.

Помач шанхайскім забастоўшчыкам.

Цэнтральны Камітэт III Інтэрнацыяналу асыгнаваў мільён даляраў на дапамогу шанхайскім забастоўшчыкам. Апрача таго пастаноўлена расначаць збор грошы на дапамогу кітайскім работнікам па усім СССР.

Заява прадстаўніка Кітаю ў Лізе Народаў.

Прадстаўнік Кітаю ў Лізе Народаў Шах-Сін-Ху заявіў журналістам, што дарма дзяржавы думаюць, быццам цяпер, як калісьці, 400-мільённы народ, які сьведама імкнецца да сувэрэннасьці (незалежнасьці), перастрашыцца ды ўступіць перад гвалтам. Гэтыя часы ўжо мінулі назаўсёды. Трэба толькі зразумець, што прысутнасьць чужых аружных сілаў на тэрыторыі Кітаю можа справакаць непажаданыя, але і цяжкія да стрыманьня здарэньні, за якія хай пасьля не вінавацяць кітайскага народу. „Мы жадаем міру, але—бяз роўнасьці ў умовах ды наагул у міжнародавых адносінах — які-ж можа быць мір? Трэба, каб усе чужземцы добра зразумелі, што мы, кітайцы, старыя і малыя, паўночныя ці паўдзённыя, можа і розьнімся паміж сабой палітычнымі ды сацыяльнымі перакананьнямі, але ўсе, як адзін, аднолькава згодны, калі справа датычыць заможнай палітыкі: мы ўсе дамагаемся незалежнасьці і самастойнасьці нашай дзяржавы“.

Амэрыканскі Сойм—аб кітайскіх падзеях.

Амэрыканскі Сойм прыняў большасьцю 259 проці 44 галасоў рэзалюцыю, якая дамагаецца ад прэзыдэнта, каб яго ўрад зараз-жа расначаў з Кітаем перагаворы — без паразуменьня з іншымі дзяржавамі.

ХРОНІКА.

У пятыя ўгодкі сьмерці Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага). З прычыны таго, што ў гэту суботу, 26-га лютага, мінае пяць гадоў ад дня сьмерці выдатнага беларускага пісьменьніка Ядвігіна Ш., — Цэнтральны Гурток Т-ва Беларускае Школы замест намечанае на гэты дзень лекцыі грам. А. Зянюка аб зямельным пытаньні вызначыў лекцыю грам. А. Луцкевіча, пасьвячоную творчасьці памершага пісьменьніка.

Лекцыя, як звычайна, адбудзецца ў памяшчэньні Гуртка (вул. сьв.-Ганны № 2) у 7 гадз. увечары.

Водгукі арышту паслоў. „Rzeczpospolita“ у № 54 з 24 лютага падае далейшыя весткі аб сялянскіх дэманстрацыях з пратэстам проці арышту паслоў Грамады. У м. Скідалі ў дэманстрацыі прымалі ўчасьце 2.000 душ. Падобныя-ж дэманстрацыі адбыліся ў Ашмяне, Маладечне, Вялейцы (пав.) і Лебедзеве.

Паводле інфармацыі „Kur. Wil.“, паліцыя арыштавала старшыню вялейскага камітэту „Грамады“, Аляксандра Антановіча. Вінавацяць яго, ведама-ж, у „камунізьме“, „падарожах у Менск“, „прывозе стуль інструкцыяў для Камітэту Партыі Зах. Беларусі і... Грамады“ і т. п.

Польска-літоўская маніфэстацыя. У сувязі з пахаронамі д-ра Яна Бассановіча, у якіх прынялі ўчасьце, паміж іншым, беларускія навуковыя і прасьветныя ўстановы,—арганізатары пахаронаў зрабілі маніфэстацыю ў духу польска-літоўскага паразуменьня. Польскія прадстаўнікі былі вітаны вельмі горача,—за тое-ж беларусам сьвядома зроблены рад прыкрасьцяў. Калі ад імя Беларускага Навуковага Т-ва і Т-ва Беларускае Школы, прыслаўшых вянкі на труну Бассановіча, папрасіў на магіле слова старшыня Белар. Нац. Камітэту грам. Савіцкі, яго „ветліва“ папрасілі... не прамаўляць! Відаць, прадстаўнікі літоўскага грамадзянства прызнаюць гаварыўшага ад імя Інстыт. Гаспадаркі і Культуры кс. Станкевіча за „адзінага прадстаўніка беларускага грамадзянства“,—хаця ані да Белар. Навуковага Т-ва, ані да Т-ва Белар. Школы кс. Станкевіч не ўваходзе. Таксама названыя ўстановы аказаліся дэманстрацыйна абойдзенымі пры запросінах на ўрачыстую акадэмію ў чэсьць памершага...

Відаць, фашыстаўскі курс перакінуўся з Коўна і да віленскіх літвіноў, якія дагэтуль ішлі поплеч з беларускімі культурна-асьветнымі ўстановамі і дзеячамі.

„Незалежным сацыялістам“ не шанцуе! Яшчэ зусім нядаўна праф. саюз будаўляных работнікаў лічыўся галоўнай крэпасьцю „незалежных сацыялістаў“ — з п. Годводам на чале; бо-ж і запраўды гэты магутны саюз быў апанаваны гэтай партыяй. Аднак, у апошнія часы палажэньне зьмянілася. „Незалежныя“, трымаючы саюз у сваіх руках, ня лічылі патрэбным лішне турбавацца аб інтарэсы работнікаў і аб паляпшэньне іх цяжкога быту, дык нічога ў гэтым кірунку і не рабілі. Прыкладам, на каналізацыйных работах зарабляюць ня больш, як па 3 злоты ў дзень. Можна сабе прадставіць, як жыве за гэтыя грошы работніцкая сям'я, у якой душ пяць народу! У такіх варунках справа здабыцьця падвышкі платы зьяўляецца прост неабходнай. Але — саюз нічога не зрабіў... Павадыры саюзу з партыі „незалежных“ ня хочуць „задзірацца“ з Магістратам, і ў гэтым—разгадка іх бязьдзейнасьці.

Гэта выклікала вялікае нездаволеньне гаспадаркай „незалежных“ сярод работнікаў, аб'яднаных у саюзе. Гэтымі днямі на сходзе будаўляных работнікаў прадстаўнікоў „незалежных“ ніхто і слухаць не хацеў, ды ў новы ўрад ім з вялікім трудом удалося правясьці ўсяго толькі аднаго свайго кандыдата...

Такі-ж лёс сустрэў „незалежных“ і ў скураных работнікаў: работнікі не далі ім навет гаварыць!

Гэтак з кожным днём таюць сярод работніцкіх масаў уплывы „незалежных сацыялістаў“, якія няздольны рашуча выступіць у абароне работнікаў, ды фліртуюць з буржуазіяй. Хутка ад усяе гэнае партыі ў Вільні астанецца адны толькі „генаралы“ — бяз арміі.

Хочуць арганізацыі, ды ня хочуць пэпэсаў. Работнікі вырабу цукерак, якіх у Вільні маем каля 200 душ, ужо даўно хочуць з'арганізавацца ў сваім прафэсіянальным саюзе. Але саюз спажывецкіх работнікаў, які мог-бы і павінен з'арганізаваць і работнікаў цукерак, знаходзіцца ў руках ППС (правіцы), якая ўжо добра дадзела віленскім працоўным масам (як і ў-ва ўсей Польшчы!) сваей палітыкай разьбіваньня работніцкае еднасьці ды згодніцтвам з пануючай буржуазіяй, — дык людзі і слухаць ня хочуць аб тым, каб ісьці пад пэпэсаўскую каманду. Тварыць-жа свой асобны праф. саюз работнікаў цукерак — справа дужа няўдзячная, бо гэтак распыляюцца работніцкія сілы.

Каб выйсьці з утварыўшагася палажэньня, сярод работнікаў цукерак узьнялася такая думка: стварыць сваю самастойную сэкцыю пры саюзе спажывецкіх работнікаў— з тым, каб сэкцыя мела і свайго асобнага сэкрэтара.

Цікаўна, ці паны пэпэсы адважацца перашкодзіць ім у гэтай слушнай справе?

Шаўцы арганізуюцца. Да нядаўнага часу саюз шаўцоў быў у вельмі сумным стане. Работнікі ня цікавіліся агульнымі справамі, сяброўскіх складак не плацілі. Але цяпер справа крыху палепшылася: людзі пераканаліся, што без сваей крэпкай арганізацыі яны ніяк ня здолеюць даць адпор наступу капіталу, ня здолеюць палепшыць свайго быту і заробкаў. Вось-жа на апошнім сходзе саюзу запісалася звыш ста душ — ня лічучы камашнікаў, якія з'арганізаваны ўжо даўно і маюць 120 сяброў.

Трэба адзначыць, што работнікаў скуранoе прамысловасьці павінна-б быць у саюзе шмат больш — па-над тысячу душ. Мо' добры пачын шаўцоў прыцягне іх усіх у сваю прафэсіянальную арганізацыю?

Афіцыяльны курс грошы на 25 лютага. Даляр — 8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 58 гр.

25./II. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70 Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Уладзімер Канчэускі.

Пасьля доўгае хваробы памер у Вільні 23 лютага Уладзімер Канчэўскі, бацька ведамых беларускіх дзеячоў Арсеня Канчэўскага (засуджаны на 4 гады вастрогу, знаходзіцца ў „Вронках“) і Ігната Канчэўскага (памер пару гадоў назад). Просьбы сям'і, каб улада дазволіла перад сьмерцяй бацькі прывезьці ў Вільню сына Арсеня—разьвітацца, а пасьля — пахаваць бацьку, — асталіся без адказу. Пахароны адбыліся ў чацьвер ўвечары. Апрача сям'і і знаёмых нябожчыка, сабраліся аддаць апошнюю паслугу нябожчыку рад ведамых беларускіх дзеячоў і таварышоў сыноў памершага.

Вечная памяць добраму грамадзяніну, узгадаваўшаму сваіх сыноў на шчырых барацьбітаў за працоўны народ!

Моладасьць.

Бура. Ноч цёмная. Круцяцца хмары,
І вецер трывожна гудзіць і шыпіць;
Ды лоскаты грому разьюшанай буры
Ня могуць парываў душы затушыць.

Імкнемся туды, гэй, у даль лятуценьня!
Імкнемся у вечную сінюю даль,
Дзе б'ецца крыніцай жывою тварэньне,
Дзе ціха сьпявае чароўны харал.

Ня зломіць нішто нашай Волі, Імкненьня —
Ні бура, ні ноч, ні ланцуг, ні мэталь;
Мы—сымбаль кіпучасьці, сымбаль тварэньня,
Зьгнясцем мы зялеза і скрушым мы сталь!

Ад земляў Усходу па сам край Заходу
Парушым мы сьвет у дзікі карнавал...
Мы—краскі жыцьця чалавечага роду;
Імкнемся у даль, гэй, у даль, гэй у даль!!!

Ліпень 1926 г. **Х.**

* * *

Раскідаў месяц перамёты
Над соннай шэраньню гаёў...
Заснула цёплая драмота
У сьнежных занізях палёў.

I люба мне,—ў вячэрняй муці
Прыпомніць Днепр, Дзьвіну і Сож...
Люблю глядзець, як нехта круціць
У прасторах месячную дрож...

Зіма, зіма!.. ў марозных бомах
Прагорклі казкі лучнікоў,—
І зор зялёная салома
У сьнежных вышыўках вакон.

А ўсё-ж люблю ў начную дую
Глядзець на сьнежныя плятні, —
Прыпомніць ў думках дарагую
І вёсень зьнікшыя агні.

І ждаць, як сінім пералівам
Усплыве вясна на журавах,
Як будуць сонныя яліны
Іграць на сонечных струнах.

Як зьвесіць месяц перамёты
Над вэльмам росных тумаoў,
І зьнікне ў далечах сумота
На шэрых крыльлях журавоў.

(„С. Б.“) **Кляшторны.**

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

„Польска-беларускае паразуменьне“.

(з Баранавіч).

Трэба, аднак, прызнаць, што нічога няма лягчэйшага, як ашукаць польскую прэсу; бо-ж трудна згадзіцца з тым, што яна сьвядома друкуе „качкі“ з правінцыі аб беларускім жыцьці, якімі ўсьцяж і корміць сваіх чытачоў. Вось адзін з сьвежых прыкладаў.

Вядомы „доктар“ Паўлюкевіч бярэ з сабой з Вільні сваю „цёплую кумпанію“ на чале з Вярнікоўскім і аж у шасьцёх прыяжджаюць у Баранавічы, едучы ў Нясьвіж, затрымоўваюцца ў малым пакоіку гатэлю „Варшаўскага“, зазываюць туды двух хуліганаў баранавіцкіх, што самавары з вокан у жыдоў крадуць, і пішуць нібы рэзалюцыі, каторыя далучаюца да карэспандэнцыі за пячаткаю „Рады“ Паўлюкевіча, ды гэта ўсё „гоняць“ у Варшаву. Праз пару дзён „Głos Prawdy“ і іншыя газэты адбіваюць гэткую паўлюкевічаўскую „качку“ пад шумным назовам „Białoruska Konferencja“ — чуць не Заходняе Беларусі! А ў Баранавічах сьмяюцца з гэтага і палякі і беларусы. А тым больш, што Паўлюкевіч зрабіў тут толькі тое, што выдаў паўнамоцтва на „работу“ ў павеце асобе, каторую, як пасьля аказалася, за правакацыйную дзеяльнасьць і кражу самавараў усе адкінулі ад сябе. Але аб гэтым пагутарым другім разам...

Дык вось як „робіцца“ беларуска-польская вышэйшая „палітыка“! **С—і.**

Бойкі замест культурнае працы.

(Пружанскі пав.).

Цяжкі сум ахапляе душу чалавека, гледзячы на нашу моладзь у м. Картуз-Бярозе, Пружанскага пав., якая ніяк ня можа адкінуць ад сябе надта дурныя прывычкі, як п'янства, праз каторае ня раз даходзе да бойкі.

Так у нядзелю 13-га лютага задумалі зрабіць нашы хлопцы вечарынку са скокамі, памешканьне пад якую адпусьціў сябра гуртка Грамады Мікалай Бредка, бо рабілі вечарынку пераважна сябры гуртка. І як гэта водзіцца—на скоках трэба зрабіць па бутэльцы, але так зрабілі, што аж адзін аднаго набілі. Найболей пацярпелі Адам Чаркес і Рыгер Залеўскі (сябра); першаму хтось адарваў рукаво ад фрэнча, Залеўскі-ж, упаўшы ў мэлянхолію, паабіваў мусіць сабе кулакі і павырываў валасы, бо біў кулак аб кулак і рваў сябе за валасы, крычучы: дайце „гаера“ заб'ю! Кісялевіч Антон і Краўчынскі Аляксандар таксама ў гэтай кумпаніі былі, але больш цьвярозыя, чым другія. Апрача ўспомненых, прыймаў учасьце ў бойцы Мікалай Кутнік, які быў самым зарывайкай.

Так жыве наша моладзь—бяз культурнай працы, за якую вельмі шчыра браліся. Хацелі паставіць спэктакль, але ніяк дазволу не маглі атрымаць, і вось, цяпер ад нуды пачалі рабіць такія віз[illegible]ія забавы.

Не, браткі мае! Беражыцеся гэтага алькагольнага яду, дык ня будзеце пасьмешышчам для другіх, а чым траціць грошы на гарэлку—лепш выпісаць газэт, кніг у сваей роднай беларускай мове. Можна рабіць і і гульні, але-ж не такія брудныя, як робіце. Не забывайцеся, што ворагам нашым гэта на руку, і яны, гледзячы на вас, будуць зубы скаліць, бо і ёсьць з чаго!.. **„Вона“**

Духоўны Бацька.

(Кляшчэлі Бельскага павету).

Наш поп Панько, быўшы афіцэр, за шлюб, хрэст, хаўтуры і т.д. дзярэ, як можа: умовіцца дома, а як абгледзіць, што хата ці конь добрыя — дык зараз-жа цану зьменіць, і папробуй сьмялец скажы, што дорага, дык зараз-жа за каўнер дый на двор выкіне. У царкве рэдка каб каго ня вылаяў або каб не пацягалі па царкве ягоныя паслушнікі; пасьмей толькі сказаць каму, што — дорага споведзь, калі ён наракае, што ня ходзяць к споведзі. Цяпер пасьля таго, як наш пасол, барацьбіт Валошын, зачапіў папоў, то наш поп парашыў даць адказ, але перад сваёй пагрознай прамовай, відаць, выпіў ня мала віна (за ц. варотамі, бо выйшаўшы адтуль яшчэ аблізываўся, як пасьля чаго смачнага), крычаў, пагражаў кулакамі і страшыў, што кепска будзе тым, хто будзе слухаць, закідаў балотам нашых барацьбітаў, таксама ўсіх беларусаў. Ведама не без таго, дзе-недзе былі ўзгалосы па слове ад людзей — дык поп зараз-жа: „а кто это“? Але кожны баіцца быць пацяганы раней па цэркві, а пасьля па пастарунках, дый і поп—афіцэр напэўна па звычцы носіць пры сабе аружжа. Што гаварыць аб прыхаджанах калі і з папом ні адзін дзяк ня можа быць, зараз знойдзе прычыну і кажа: дачка мая з сынам ляпей патрапяць, а да таго й сам паможа й грошы ўсе астануцца у аднэй кішані. У насьледні час быў дзіякан, каторы сам езьдзіў на хаўтуры, а папу прывозіў гатовыя грошы, а поп даваў яму ¼ таго, што зарабіў сам дзіякан. А колькі даваў грошай поп дзіякану пры сумесным заробку, дадумацца лёгка, бо дзіякан меў выгляд бядака й змушаны быў кінуць кумпанію. Будуе поп хлявы за людзкія грошы, на што раней пачаў зборку і, вядома, хто можа, дае, а былі й такія, што проста сказалі: няма адкуль навет заплаціць падаткаў, дык за гэта таксама поп у царкве лаяў, кажучы: вось прыдуць сьвяты, беларус нап'ецца і будзе валяцца і на гэта ў яго грошы будуць, а для Бога дык няма“.

Папу зайздрасьць, як хто нажыў якую лепшую хату ці каня, або хто ў сьвята можа і вып'е келіх які сівухі. А як-жа нам трэба зайздросьціць, калі поп ладзіць гульню для ўсяго начальства з канфідэнтамі разам, дык там напэўна сівухі ня п'юць і грошаў поп не шкадуе. Езьдзіць, таксама, поп не на вазе, а на брычцы, дый лепшым конём, як

у-ва ўсіх. Хадзіў поп і зьбіраў збожжа са сваей мерай, а людцоў дужа ёсьць такіх, што з сябе апошнія сокі выдушваюць, бо ўжо хлеб свой праходзе, але для таго, каб ня мець няпрыемнасьці даюць па магчымасьці т. ё. ня поўную мерку; дык поп ізноў лае і кажа: „Для Бога дык няма"!? Дзяды і бацькі нашы кажуць, што зусім сьвет перамяніўся, бо яны прывыклі ўсё прасіць ад Бога, а цяпер наш поп усё зьбірае для Бога.

На бруд, каторым закідаў й закідае нас усіх наш поп, адказаць змушаны так: як ён толькі прыехаў да нас, дык мы асуджалі, што мала ў нашага папа ўгалаве алею або пуста, бо занадта высока яе трымае, але-ж цяпер даведаліся, што алею саўсім няма, а толькі балота таму, што толькі балота і вылівае з яе. **Анёлы.**

„Ацец духоўны" стараецца!

(М. Ліда).

У м. Ліда поп Уладзімер Кірык, каб змагацца з Грамадой па цэлым Лідзкім павеце, залажыў у Лідзе аддзел паўлюкевічаўскай дэфэнзыўнай Рады. Кіраўніком аддзелу паставіў свайго дзяка, — чалавека скалечанага фізычна і духова, — а ў сябры аддзелу ўвайшлі: царкоўная старажыха, ды сын і дачка яе. Адным словам, увайшлі ў аддзел увесь клір ды пара цёмных фігур. Вось і пашла праца. Сам-жа поп зараз-жа пасьля арыштаў паехаў на павет з паўлюкевічаўскімі адозвамі і пачаў падкідаць іх усім фурманкам, якія толькі спатыкаў па дарозе. Ну, ведама: народ разабраўся, у чым тут справа,— і шчасьце папа, што ад'ехаў ён ужо далёка, а то людзі хацелі дагнаць яго і добра „падзякаваць" за яго работу. Такі выпадак быў у Лябёдзкай гміне...

Дарма Паўлюкевіч дае авансікі на лідзкі аддзел, бо гэты аддзел не дасягае сваей мэты; да гэтага часу не ўдалося яму справакаваць ніводнага гуртка Грамады.

Той самы поп, ня гледзячы на тое, што большасьць прыхаджан хоча сьвяткаваць па стараму, проціў волі ўсіх служыць па новаму стылю. І нічога дзіўнага. У мінулым годзе ён атрымаў за гэта аднаразовай запамогі 500 зл., а ў гэтым напэўна даслужыцца да тысячы. **Пранырa.**

Нам пішуць з вескі што:

✕ Камандант пастарунку ў м. Крынках, Горадзенскага пав., арыштаваў у в. Саньніках тэй-жа гміны сябра Грамады Сымона Каліша і трымаў яго двое сутак, дамагаючыся, каб сказаў што-сь аб Камуністычнай працы. А за гэта даваў яму рознай ежы ды напіткаў. Якія адказы даваў Каліш каманданту,— невядома; вядома толькі, што цяпер „сябра" гэты вельмі часта ходзіць на пастарунак і мае блізкія адносіны з камандантам (як відаць, спадабалася яму паліцэйская гэрбатка ды гарэлка). Мімавольна зьяўляецца пытаньне: Ці душа Каліша Сымона каштуе толькі трыццаць срэбнікаў?

✕ Поп Сваротаўскай парафіі, Навагрудзкага пав., ня маючы ніякага даходу ад парафіян, — перад калядамі хадзіў і жабраваў па вёсках. За тое на каляды зрабіў гучную вечарынку, а музыканту заплаціў аж 15 зл.

✕ Вучыцель польскае школы ў в. Івашкевічы, Міжавіцкае гм., Ваўкавыскага пав., Тамаш Дулеба (гальлілеюш) так „добра" вучыць нашых дзетак, што праз тры — чатыры гады навукі яны ня ведаюць навет усіх літараў і з горам папалам расьпісываюцца. Дровы ж на школу спаліваe толькі ў сваей кватэры, а дзеткі ў школе мерзнуць. А ўсё жаліцца, што яму дрэнна жывецца і што нудна надта, ды ўгаварывае сялян, каб тыя, ня гледзячы на беднату, справілі яму за 350 зл. радыё ды паставілі ў яго кватэру, бо ў іншым месцы пярун можа яго пабіць.

✕ Радны Вялейскае гміны і сябра Вялейскага павятовага Соймiку, Бохан Мікалай пагражае Янку Бохану падлажыць стрэльбу-адразанку, ды пасьля пацягнуць яго да адказнасьці за гэта, хочучы такім чынам адамсьціцца яму за праўдзівыя паказаньні ў судзе, пашкодзіўшыя Мікалаю Бохану ў яго судовай справе. Ці не пара ўжо выпісаць воўчы білет гэтаму раднаму?

✕ Сьцяпан Ошмайкевіч з в. Бабіева, Гарадэчанскае гм., Навагрудзкага пав., працаваў з сваей дачкой чатыры дні ў асадніка Пэцкаля. Калі-ж пашоў да яго па грошы,— не атрымаў нічога, бо асаднік скасаў, што ў яго прапала сякера і што таму не заплаціць Ошмайкевічу. Так і прапала праца Ошмайкевіча дарма

Той жа асаднік Пэцкаль, едучы ў м. Карэлічы, спаткаў па дарозе грамадзяніна Юльяна Меляняка з в. Бабіева і давай яго нагаварываць, каб ішоў ён па вёсках і шукаў камуністычнай літаратуры, што за гэта дасьць яму сто злотых.

✕ Слугі князя Сапегі не даюць жыцьця некатарым сялянам вёскі Прудцы, Скідэльскае гміны. Так, лясьнічы Жывецкі піша па 20 пратаколаў за пашу скаціны па лесе на таго, хто яму нічога не дае, ня гледзячы на тое, ці пасецца чыя скаціна па лесе, ці не. А таму, хто поіць лясьнічага гарэлкай, і скаціну можна пасьвіць і дроў воз — другі можна набраць, і ніякіх пратаколаў няма.

✕ Сяляне вёскі Уласы, Баранавіцкага павету, аддалі сваё поле стральцу на паляваньне за 150 зл. на тры гады і за гэтыя грошы хацелі пабудаваць мост. Паехала трох сялян па дуб на мост і перш за ўсё прапілі 5 зл. А як усе грамадой паехалі па дуб, дык прапілі аж 56 зл. За рэшту грошы купілі дубу, але мала зусім, так што ехаць дамоў было зусім лёгка. Цяпер аказалася, што мост даканчыць нямажна, бо не хапае драва; відаць, ён так і застанецца недаканчаны! Вось, як умеюць гаспадарыць нашы людцы!

✕ У польскай школе ў вёсцы Маляховічах, Гарадзіскае гміны, Баранавіцкага пав., вучыцелька вучыць дзяцей толькі розныя цацкі плясьці з пеперы, а чытаць і пісаць — дык як сабе хацела. Тое і ўмеюць дзеткі, што іх вучаць, бо толькі сьлібізуюць яшчэ. А праваслаўным кажа вучыцелька і ў сьвята іcьці ў школу, каб часу не марнавалі, а вучыліся. Усёроўна нічога ня ўмеюць!

Што-ж будзе?

Ня гром то нябесны:
То гоман пратэсту
Нясецца ад вёсак,
Нясецца ад местаў;
То скарга народу ліецца.
  Туды, дзе палацы,
  Ляці голас працы!
  Ляці—пасьпяшайся,
  Там стогнам раздайся,
  Дзе пышна нядбайна жывецца...
Бі ў дзьверы сталёвы:
Гэй!—скіньце аковы!
Ды дайце-ж ім волю —
За люд хто працоўны,
За лепшую долю
Стаў першы, стаў шчыра змагацца.
  Ці-ж мала йшчэ крыўды?!
  Гэй, людзі вы, людзі...
  Мы волі жадаем,
  Мы сьмела пытаем:
  Што-ж з гэтага будзе?..
Як хвалі на моры
Так тысячаў грудзі, —
Як віхар ў пpасторы
Шугае стагнучы:
Ў душы набалелай
Штосьць буйна клакоча,
  Рукою самлелай
  Ў простор паграджае
  Да праўды гукае...
  Дзе-ж праўда сьвятая?!
  Эх доля гаротніка злая...

22./I. 1927 г. **Міхась Васілёк.**

З Радавае Беларусі.

2-гі Усебеларускі Краязнаўчы Зьезд.

Ад 10-га да 13-га лютага ў Менску адбываліся паседжаньні Другога Усебеларускага Краязнаўчага Зьезду.

У працах Зьезду прымалі ўчасьце 182 дэлегаты, у тым ліку з акругоў—34, з раёнаў — 82, з цэнтральных установаў — 45, ВНУ—21. Па нацыянальнаму складу — 150 беларусаў, 21 жыдоў, 6 расейцаў, 3 украінцаў і 2 палякоў.

З дакладаў выясьнілася, што ў межах Радавае Беларусі істнуе 240 краязнаўчых т-ваў, якія яднаюць 12 акруговых і 93 раённых т-ваў і 130 розных гурткоў. Лік сяброў краязнаўчых т-ваў за апошні год узрос у два разы. Летась усе сродкі арганізацый складалі 4.615, сёлета — 8.500 руб. За год працы сіламі краязнаўчых арганізацый адчынена 16 музэяў і сабрана 10.705 экспанатаў; апроч таго, сабрана 87.230 картак-слоў, 179 розных калекцый, 413 апісаньняў, 500 анкет і 736 іншых матар'ялаў.

13-га лютага зьезд прыняў рэзалюцыі па дакладах аб працы ЦБ краязнаўства і прапазіцыі камісій зьезду. Зьезд канстатаваў, што да гэтага часу ў краязнаўчую справу мала ўцягнута прафэсура, выкладчыкі і студэнцтва вышэйшых навучальных установаў і тэхнікумаў. Для належнае пастаноўкі краязнаўчай справы пры ВНУ трэба арганізаваць сталыя катэдры краязнаўства.

Хатнія рамествы займаюць у Радавай Беларусі даволі паважнае месца; зьезд ухваліў зьвярнуць большую ўвагу на вывучэньне гэтай галіны народнай гаспадаркі.

Зьезд пастанавіў больш уважліва адносіцца да вывучэньня гісторыі Беларусі, якая раней вывучалася тэндэнцыйна; дзеля гэтага трэба зьбіраць адпаведныя матар'ялы і вывучыць паасобныя раёны БСРР, каб на падставе апошніх грунтаваць вывучэньне гісторыі Беларусі: трэба распачаць працу па зьбіраньню народных паданьняў, архіўных матар'ялаў і інш., якія маюць адносіны да гісторыі раёну. Поруч з гэтым трэба зрабіць захады для захаваньня курганоў, капцоў, розных магільнікаў, якія маюць археалёгічную цэннасьць, ад бяссыстэмнага нішчэньня іх. У надыходзячую вясну трэба распачаць плянавы ўчот усіх могільнікаў у кожным сельсавеце паасобку.

Прымаючы пад увагу, што да гэтага часу мала вывучаны прырода і клімат Беларусі,—у аснове дзейнасьці краязнаўчых арганізацый павінна быць больш дасканальнае вывучэньне прыродных і геаграфічных асаблівасьцяў краю.

Асяродкам выхаваўчай краязнаўчай арганізацыі ў раёне павінен быць краязнаўчы музэй з паступнымі 3 аддзеламі 1) прыродагеаграфічны, 2) грамадзка-эканамічны і 3) культурна-гістарычны. Музэі трэба так арганізаваць, каб яны адбівалі ўсё жыцьцё раёну і прыцягвалі-б да сябе ўвагу шырокіх колаў працоўных мас.

Каб мець прыклад вывучэньня раёну, даручыць ЦБК закончыць вясной распачатае вывучэньне Асіпавіцкага раёну, а матар'ялы надрукаваць не пазьней восені гэтага году.

Зьезд ухваліў больш рашуча ўцягваць у краязнаўчую справу жыдоўскае насельніцтва, дзеля чаго трэба наладжаваць папулярныя лекцыі і сходы, у плян працы жыдоўскіх секцый краязнаўства трэба ўключаць дасьледаваньне жыдоўскага земляробства і эканомікі жыдоўскага мястэчка.

У Інстытуце Беларускай Культуры.

Аддзел мовы і літэратуры мае прыступіць да апрацоўкі гістарычнага слоўніка беларускай мовы.

Музычная падсэкцыя ІБК апрацавала звыш 500 беларускіх народных сьпеваў і мэлёдый.

На апошнім паседжаньні навуковай рады ІБК канчаткова прыняты выдавецкі плян ІБК. Згодна з гэтым плянам друкуюцца ўжо і будуць друкавацца працы праф. Растаргуева, Шчакаціхіна, Г. Гарэцкага, зборнік па мовазнаўству, этнаграфіі і літэратуры, краёвы слоўнік, фольклёрны матар'ял, акадэмічнае выданьне твораў беларускіх пісьменьнікаў і інш. Агулам каля 220 друкаваных аркушоў.

Адказ Варшаўскага Навуковага Т-ва.

Інбелкульт у свой час зьвярнуўся да Варшаўскага Навуковага Т-ва з просьбай аб дазволе выкарыстаць для складаньня беларускага слоўніка рукапісны фольклёрны матар'ял вядомага польскага этнаграфа Федаровіча, які дасьледаваў беларускі фольклёр.

Варшаўскае Навуковае Т-ва адмовіла ІБК выкарыстаць гэты матар'ял. З гэтае прычыны слоўнікавая камісія ІБК прыступае да апрацоўкі асобнага слоўніка па тых матар'ялах Федаровіча, якія да гэтага часу надрукаваны.

Веснавая пасеўная кампанія.

Агульны крэдытны фонд мэтавых пазык на II квадру сёлетняга апэрацыйнага году, якая па сутнасьці зьяўляецца квадрай веснавой пасяўной кампаніі, складаецца з 2 мільёнаў 744 тысяч руб.; блізу ўсе гэтыя сродкі будуць выкарыстаны на набыцьцё насеньня, асабліва травянога, с.-г, машын і інш.

Апроч таго, вызначана 200 тысяч руб. у асноўны капітал нізавой сеткі для ўзмацненьня яе працы; гэтыя сродкі павінны пайсьці на веснавую пасяўную кампанію.

Рэшта сродкаў пойдуць на ўзмацненьне саматужнай прамысловасьці, пераапрацоўку с.-г. прадуктаў і інш.

Апроч гэтага, у зьвязку з недародам у некатарых раёнах, на загатоўку кармоў накiравана 225 тысяч руб. Дзякуючы гэтаму, будзе магчымасьць зьберагчы насенны матар'ял.

Гаспадарчы поступ.

Пляц пасеву кармавых траў за апошні год у БСРР значна пашырыўся. У 1913 г. пасевы кармавых траў займалі 4,5 пр. усяе пасяўное плошчы, у 1920 — 1,5 проц. у 1926 годзе 7,0 проц.

Паштовая скрынка.

Засіму. Вершаў Вашых не зьмяшчаем, трэба Вам яшчэ шмат папрацаваць над імі.— **Фядосу Паўлу.** Усе адозвы Грамады былі легальныя, таму прычапіцца да іх ня можна. Што Грамада зьліквідавана — гэта ня праўда. — **Сярмяжніку.** Зьмяшчаем толькі частку, рэшта нічога цікаўнага не прадстаўляе.—**Сыну гаспадара.** Верш Ваш не падыходзіць да друку.

Усячына.

Радыё кіно.

Вядомы амэрыканскі радыё-інжынер д-р Андэрсон паведаміў прадстаўнікоў друку, што яму ўдалося вынайсьці апарат, які ператварае ў жыцьцё ідэю радыё-кіно. Апарат гэты можа перадаць на невялікім хатнім экране з кінэматаграфічнаю яснасьцю фільм, які ідзе ў памешканьні радыё-станцыі. Апарат гэты вельмі просты і танны.

У сучасны мамэнт Андэрсон вядзе перамовы з трэстам радыё-фільмы Амэрыкі, які хоча купіць за мільённую суму гэты апарат і выпусьціць на рынак сэрыю такіх апаратаў.

Згодна слоў Андэрсона кожнаму цяпер удасцца, ня выходзячы з дому і не падымаючыся з крэсла, убачыць па радыё-фільмы, якія ставяцца — у канкурэнцыю кінаматаграфам — радыёфонамі, фільм бязумоўна гаворачы, бо сутнасьць сучаснага радыё ёсьць перадача гаворкі.

Новая маска.

Аўстралійскі вучоны Картэр надумаў спэцыяльную маску, якая выробляе тлён.

У маскі, якімі да гэтага часу карысталіся вуглякопы і вадалазы ў часе працы, павінна было бесперастанку праходзіць сьвежае паветра, у іншым разе рабочым пагражала сьмерць. З новай вынаходкай апаска сьмерці ад нястачы тлёну пад вадой або пад зямлёй канчатковае зьнікае. Гэта надта спрашчае працу вадалазаў і шахцёраў.

Спробы ўваскрашэньня нябожчыка.

У рымскай бальніцы (Італія) памёр ад сухотаў хворы Гарскарыні. Праз паўгадзіны пасьля яго сьмерці былі зроблены спробы ўваскрашэньня нябожчыка праз упрыскваньне яму спэцыяльнай жыдкасьці — адрэналіна. Нябожчык аджыў, прыпадняўся, папрасіў есьці, а праз паўгадзіны ізноў памёр, на гэты раз ужо канчаткова.

Аб чым клапоціцца польскае грамадзянства.

Газэты паведамляюць, што ў падзямельлях Вавэльскага сабору ў Кракаве ўсьцяж ідзе вялізарная праца: аднаўляньне мэталічных саркафагаў (трунаў) польскіх каралёў, каралеваў, сьвятых біскупаў, навет—„ніжэйшых духоўных сабору"... „У гэтых катакомбах (падзямельлях) будзе зроблена мармарная падлога, дый наагул усё будзе пекна адбудавана, будуць пастаўлены газавыя печкі",—каб усім нябожчыкам было цёпла... Усё мае быць зроблена—паводле апошняга слова тэхнікі...

Правыя газэты наракаюць на ўрад, што мала дае грошаў на гэту пільную справу, а больш абяцуе даць у 1928 г. „А гэты рэмонт глытае аграмадныя сумы". Гэтыя сумы зьбіраюцца — „з складак публічных". — Пасьля адозвы Камітэту шмат гмінаў прыслалі значныя сумы.

Здаецца, ахвяраваў на гэтую мэту пару тысячаў і віленскі магістрат.

Дзіўныя рэчы.—На вуліцах жывыя людзі падаюць, самлеўшы ад голаду і холаду... „Голад—галоўны і запраўдны ўнутраны вораг, які пагражае — рассадзіць дзяржаву знутра", казаў толькі-што адзін з паслоў у Сойме... А польскае грамадзянства занята — дасло̆ўна — „размалёўваньнем трунаў" (як сказана ў Эвангэліі) ды клапоціцца, каб у Польшчы было цёпла перадусім розным высокім нябожчыкам, якія памерлі 3—4—5 вякоў назад...

Рэдактар Выдавец: Альберт Эйсак. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.